Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Журналіст

ВУЧЭБНАЯ ГАЗЕТА ФАКУЛЬТЭТА ЖУРНАЛІСТЫКІ БДУ ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

● 9 (136) ● Субота, 16 чэрвеня 1979 года. ● Год выдання XIX.

# У МІНСКІМ ІНСТЫТУЦЕ КУЛЬТУРЫ

## У добры шлях!

Інстытут рыхтуецца да хвалюючай падзеі—свайго чарговага выпуску. Відаць, таму зараз тут нейкі асабліва ўзняты настрой: не змаўкае гул у аўдыторыях, дзе горача абмяркоўваюцца пытанні, якія кранаюць усіх, асабліва тых, хто вось-вось выйдзе са сцен роднага інстытута. 413 студэнтаў у гэтым годзе заканчваюць стацыянар інстытута. Сённяшніх выпускнікоў і заўтрашніх спецыялістаў чакаюць дамы культуры, самадзейныя тэатральныя калектывы, народныя аркестры, сельскія клубы.

Студэнты авалодалі рознымі спецыяльнасцямі культасветработы. Адрасы іх будучай працоўнай дзейнасці — усе куткі нашай рэспублікі. Задача і мэта ж у іх адна: забяспечыць сёлы і гарады высокакваліфікаванымі культурна-асветніцкімі кадрамі, у якіх зараз адчуваецца вострая патрэба.

У інстытуце ідзе няспынны пошук новых, больш дзейсных форм і метадаў у сістэме падрыхтоўкі кадраў. У далейшым плануецца ўвесці комплексную падрыхтоўку будучых спецыялістаў.

На факультэце бібліятэказнаўства і бібліяграфіі кожны ведае, куды паедзе працаваць.

У дэкана факультэта Васіля Емяльянавіча Лявончыкава цудоўны настрой: з 193 чацвёртакурснікаў на «выдатна» здалі зімовую сесію 68 чалавек. Большая палова — 129 выпускнікоў напраўлена на працу ў масавыя, навуковыя, тэхнічныя, дзіцячыя і школьныя бібліятэкі розных вёсак і гарадоў.

Мы пацікавіліся:

— Васіль Емяльянавіч, што Вы можаце сказаць аб перспектывах факультэта на будучае?

— У адпаведнасці з Пастановай ЦК КПСС ад 1974 года перабудавана падрыхтоўка спецыялістаў шырокага профілю па галіновых комплексах літаратуры. У недалёкім будучым кожны выпускнік зможа паўнацэнна працаваць у бібліятэках любога тыпу. Будзе ўведзена спецыялізацыя: бібліятэказнаўства і бібліяграфія сельскагаспадарчай і мастацкай літаратуры.

Інстытут ганарыцца сваімі лепшымі выпускнікамі, якія былі першымі на працягу вучобы і (няма сумнення) будуць першымі на працоўным этапе сваёй жыццёвай дзейнасці. Гэта выхаванцы факультэта культасветработы Лідзія Кац і Валянціна Бараноўская, будучыя работнікі бібліятэк Ірына Ломаць і Лідзія Шылава і многія іншыя.

Ларыса Кароль, студэнтка факультэта бібліятэказнаўства і бібліяграфіі, дэпутат Кастрычніцкага Савета народных дэпутатаў, Ленінскі стыпендыят, староста групы на працягу чатырох гадоў.

Пажадаем выпускнікам інстытута неспакою, творчага натхнення, і, гаворачы словамі песні, ста вятроў. У добры шлях!

П. ЦУНІК,
С. ШЧАЦЬКО.

**МІНСКІ ІНСТЫТУТ КУЛЬТУРЫ БЫЎ АДКРЫТЫ 1 ВЕРАСНЯ 1975 ГОДА. НА УСІХ ФАКУЛЬТЭТАХ І АДДЗЯЛЕННЯХ ЯГО ЗАЙМАЕЦЦА 3100 СТУДЭНТАЎ. ІНСТЫТУТ РЫХТУЕ КАДРЫ БІБЛІЕГРАФАЎ, АРГАНІЗАТАРАЎ-МЕТАДЫСТАЎ КУЛЬТУРНА-МАСАВАЙ РАБОТЫ, КІРАЎНІКОЎ КАЛЕКТЫВАЎ САМАДЗЕЙНАЙ НАРОДНАЙ ТВОРЧАСЦІ, РЭЖЫСЁРАЎ КЛУБНЫХ МАСАВЫХ ПРАДСТАЎЛЕННЯЎ, ДЫРЫЖОРАЎ АКАДЭМІЧНЫХ І НАРОДНЫХ ХОРАЎ, АРКЕСТРАЎ НАРОДНЫХ ІНСТРУМЕНТАЎ, ДУХАВЫХ І ЭСТРАДНЫХ АРКЕСТРАЎ, КІРАЎНІКОЎ ХАРЭАГРАФІЧНЫХ КАЛЕКТЫВАЎ.**

**У ІНСТЫТУЦЕ ЁСЦЬ 20 КАФЕДР, НА ЯКІХ ПРАЦУЮЦЬ ЗВЫШ 260 ВЫКЛАДЧЫКАЎ, У ТЫМ ЛІКУ 65 ДАЦЭНТАЎ І КАНДЫДАТАЎ НАВУК.**

## ШКОЛА АСВЕТНІКАЎ

ЗНОВАЙ Пастановы ЦК КПСС «Аб далейшым паляпшэнні палітыка-выхаваўчай і ідэалагічнай работы» яшчэ больш зразумела важнасць падрыхтоўкі байцоў ідэалагічнага фронту і, вядома, культасветработнікаў. У нашай рэспубліцы менш чым 3 працэнты работнікаў клубаў, дамоў культуры, бібліятэк маюць вышэйшую спецыяльную адукацыю. І ў век НТР гэты недахоп востра адчуваецца. ЦК партыі, наш урад прымаюць меры па падрыхтоўцы высокакваліфікаваных кадраў культурнай асветы. Раней культасветработнікаў рыхтаваў педінстытут імя Горкага, а таксама тэатральна - мастацкі інстытут. Цяпер гэту функцыю выконвае наша ВНУ.

За параўнальна кароткі перыяд існавання інстытут добра абсталяваўся. Студэнты займаюцца ў прасторных і светлых аўдыторыях, спецыяльных класах, лабараторыях. Ёсць у нас і люстравая харэаграфічная зала. Музычныя інструменты, вучэбнае абсталяванне, кінапраектары, вылічальная тэхніка, бібліятэка — усё разам каштуе 4,7 мільёна рублёў. Гэта наглядны прыклад клопатаў нашай дзяржавы аб падрыхтоўцы новых кадраў.

Сярод выкладчыкаў інстытута — народныя і заслужаныя артысты БССР Т. Н. Аляксеева, М. Г. Захарэвіч, В. Т. Лебядзеў, Г. С. Талкачова, М. А. Федароўскі, заслужаныя дзеячы і работнікі культуры РСФСР, УССР і БССР А. А. Даброцін, С. І. Дробыш, С. М. Грабеншчыкаў, А. С. Нікалаеў.

Студэнты займаюцца на двух аддзяленнях: дзённым (факультэты культасветработы, бібліятэказнаўства і бібліяграфіі) і завочным. Працуе таксама падрыхтоўчае аддзяленне. Нашы студэнты прымаюць актыўны ўдзел у грамадскай рабоце. Многія з іх працуюць у самадзейных калектывах, бібліятэках, шэфствуюць над прафесійна - тэхнічнымі вучылішчамі. Шмат добрых працоўных спраў на рахунку нашых студэнцкіх будаўнічых атрадаў.

Кожны год мы атрымліваем нямала цёплых водгукаў, падзяк ад культурнаасветніцкіх устаноў, дзе працуюць нашы выхаванцы.

Наша ВНУ карыстаецца шырокай папулярнасцю сярод моладзі рэспублікі. Агульны конкурс паступаючых складае прыкладна 3,5 чалавек на месца. Найбольш высокі конкурс бывае звычайна на спецыялізацыях арганізатараў-метадыстаў і рэжысёраў.

У гэтым годзе інстытут набірае 800 студэнтаў: 450 чалавек — на стацыянар, 350 — на завочнае аддзяленне.

Час патрабуе свайго. І ў перспектыве наша вучэбная ўстанова будзе пашыраць набор студэнтаў. Відаць, у далейшым будзе весціся падрыхтоўка кіраўнікоў аматарскіх кіна- і фотастудый.



У нашай краіне 20 інстытутаў культуры. З многімі з іх наш інстытут падтрымлівае цесныя сувязі, супрацоўнічае. Такая садружнасць дапамагае вырашаць такія праблемы, як культурна - асветніцкая работа ва ўмовах НТР, абменьвацца метадычнай дакументацыяй, праводзіць сумесныя навуковыя канферэнцыі, дапамагаць навукова - педагагічнымі кадрамі, займацца падрыхтоўкай і перападрыхтоўкай выкладчыкаў.

У. У. ЗУБЕЦ,
в. а. рэктара інстытута.

## Лету—гатоўнасць

**У інстытуце культуры адбыўся сход актыву байцоў студэнцкіх будаўнічых атрадаў пад дэвізам: «Студэнт, будаўніцтва чакае цябе!» З дакладам аб рабоце СБА выступіў камандзір зводнага будаўнічага атрада Анатоль Пракапюк. Ён падвёў вынікі работы БА інстытута за мінулы працоўны семестр. Студэнты працавалі ў БССР, Казахскай ССР, Малдаўскай ССР, Комі АССР, г. Гагарыне. Вынік іх працы — 450 тыс. рублёў капіталаўкладанняў. Акрамя таго, юнакі і дзяўчаты аказалі вялікую дапамогу калгасам і саўгасам: прачыталі 141 лекцыю, выступілі са 152 канцэртамі, здалі ў сельскія бібліятэкі 523 кнігі, удзельнічалі ў аперацыі «Абавязак», дапамагалі ветэранам вайны, рамантавалі помнікі. Анатоль адзначыў галоўную і важную задачу байцоў БА: як мага лепш падрыхтавацца да будаўнічага семестра-79.**

**Потым выступілі камісары і камандзіры БА. Яны расказалі аб праведзенай рабоце па падрыхтоўцы юнакоў і дзяўчат да працоўнага лета. У інстытуце прайшоў тыдзень агляду гатоўнасці да 3-га будаўнічага семестра, праведзены фестываль БА «Дружба-79», усім байцам БА прачытаны лекцыі па тэхніцы бяспекі. Выступаючыя звярнулі ўвагу на важную праблему — укамплектаванне будаўнічых атрадаў.**

**З цёплымі словамі да байцоў БА звярнуўся намеснік сакратара партбюро А. С. Нікалаеў. Ён натхніў студэнтаў на новыя працоўныя подзвігі, пажадаў ім высока трымаць гонар інстытута.**

**У прынятай пастанове байцы будаўнічых атрадаў унеслі рад важных прапаноў. Так яны вырашылі правесці 16 жніўня дзень ударнай працы ў фонд В'етнама, разгарнуць шырокае сацыялістычнае спаборніцтва, палепшыць работу штаба працоўных спраў.**

З. НЕМЕР, П. САІД.

## У ДРУЖБЕ З НАВУКАЙ

Без студэнцкага навукова-творчага таварыства, якім кіруе Віктар Кірылавіч Кручык, нельга ўявіць сабе традыцыйныя навуковыя канферэнцыі, якія праводзяцца кожны год вясной. СНТТ актыўна ўдзельнічае ва Усесаюзнай алімпіядзе «Студэнцтва і навукова - тэхнічны прагрэс».

У гэтым годзе ў інстытуце праходзіла чацвёртая па ліку канферэнцыя. Яна працягвалася 2 дні. Працавала 25 секцый. Было прачытана 220 дакладаў, з іх больш паловы рэкамендавана на рэспубліканскі конкурс. Асабліва вызначыліся секцыя дзіцячай літаратуры і бібліятэчнай работы з дзецьмі, секцыя культурна-асветніцкай работы. Упершыню на канферэнцыі працавалі секцыі вакальна-харавога і інструментальнага мастацтва.

Многія студэнты паказалі глыбокія веды, уменне самастойна арыентавацца ў вялікім патоку інфармацыі і рабіць свае, асабістыя вывады.

Уладзімір Дзянісаў, студэнт 3-га курса, падрыхтаваў гісторыка-навуковы нарыс «Плошча Свабоды ў Мінску». З гэтай работай ён ездзіў у Харкаў, дзе выступаў на навуковай канферэнцыі, прысвечанай 50-годдзю Харкаўскага інстытута культуры.

Лідзія Шылава, студэнтка 4-га курса, таксама прадставіла беларускае студэнцтва ва ўкраінскай ВНУ. Яе даклад «Дзейнасць Кампартыі па развіццю бібліятэчнай справы ў Беларусі» атрымаў дыплом Усесаюзнага конкурсу.

Інстытут рыхтуе ў асноўным работнікаў культуры для сяла. Таму былі заслуханы даклады, як напрыклад: «Культурны комплекс сяла», «Асаблівасці эстэтычнага выхавання сельскай моладзі». Выступленні студэнтаў паказалі гарачае жаданне зрабіць адпачынак моладзі сяла цікавым і разнастайным.

А. ФІЛІМАНЮК.



## Магістры добрага настрою

*Свята — Дзень культасветработніка — пачалося шэсцем-прадстаўленнем студэнтаў Мінскага інстытута культуры. У калонах пад музыку ішлі прадстаўнікі двух факультэтаў інстытута.*

*«У нашым інстытуце працуюць 260 выкладчыкаў, з іх 27 — ветэраны Вялікай Айчыннай вайны. Займаецца 3100 студэнтаў», — паведамляў гасцям дыктар.*

*Калі калоны выстраіліся на плошчы перад Палацам чыгуначнікаў, зайгралі баяны. Апранутыя ў беларуу-*

(Працяг на 4-й стар.)



